УДК 94(476):930.2

**І. В. Красінскі**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр-т Незалежнасці, 4, 220030 Мінск, Рэспубліка Беларусь,
iankrasinski@gmail.com

# ПОСТРЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ ДОКАЗУ ШЛЯХЕЦТВА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

У артыкуле разглядаецца пострэвалюцыйная гістарыяграфія пытання доказу шляхецтва ў Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ). Асноўная ўвага нададзена аналізу гістарыяграфічных прац, якія асвятляюць працэдуры, прававое рэгуляванне і сацыяльнае значэнне доказу шляхецтва. Вывучэнне дарэвалюцыйных і савецкіх даследаванняў у параўнанні з сучаснымі працамі па гісторыі ВКЛ дазволіла вылучыць дасягненні і недахопы ў вывучэнні шляхецкай праблематыкі. Артыкул таксама выяўляе асноўныя метадалагічныя падыходы, што выкарыстоўваюцца ў даследаваннях дадзенай праблемы, і пралівае святло на недастаткова раскрытыя аспекты доказу шляхецтва як сацыяльнай з’явы ў гістарыяграфіі.

**Ключавыя словы:** гістарыяграфія гісторыі Беларусі; шляхта; Вялікае княства Літоўскае; доказ шляхецтва; вывад шляхецтва; гістарыяграфія гісторыі Вялікага княства Літоўскага; сацыяльная гісторыя.
Бібліягр.: 43 назвы.

**I. V. Krasinski**
Belarusian State University, 4 Nezavisimosti Ave., 220030 Minsk, the Republic of Belarus,
iankrasinski@gmail.com

# POST-REVOLUTIONARY HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM OF PROOF OF NOBILITY IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

The article examines the post-revolutionary historiography of the issue of proof of nobility in the Grand duchy of Lithuania (GDL). The main attention is paid to the analysis of historiographical works that highlight the procedures, legal regulations, and social significance of proof of nobility. The study of pre-revolutionary and Soviet research in comparison with modern works on the history of the GDL allowed to identify achievements and shortcomings in the study of noble issues. The article also reveals the main methodological approaches used in the research of this issue and sheds light on the insufficiently explored aspects of the proof of nobility as a social phenomenon in historiography.

**Key words:** historiography of Belarusian history; nobility; Grand duchy of Lithuania; proof of nobility; extraction of nobility; historiography of the Grand duchy of Lithuania; social history.
Ref.: 43 titles.

Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Гістарычнае мінулае беларускіх зямель перыяду Вялікага княства Літоўскага шмат у чым застаецца недаследаваным. Сучасныя гісторыкі імкнуцца знайсці новыя крыніцы або з іншых ракурсаў разгледзець ужо вядомыя. Актыўна развіваецца накірунак сацыяльнай гісторыі, у якой важнае месца займаюць даследаванні шляхецтва (Я. С. Глінскі, Я. К. Анішчанка, Г. М. Брэгер, А. А. Скеп’ян, У. А. Падалінскі, І. Ю. Увараў, А. А. Віннічэнка, Н. У. Сліж, С. А. Рыбчонак, Н. Н. Якавенка, А. В. Захараў, В. В. Урублеўскі, А. С. Залівака і інш.). Рознабаковае вывучэнне гэтага саслоўя падаецца важным не толькі з пункту гледжання гісторыі, але і генеалогіі, псіхалогіі, псіхагісторыі, паліталогіі, сацыялогіі, культуралогіі і іншых навук.

Сярод даследаванняў шляхецкай праблематыкі існуе шэраг пытанняў, якія недастаткова асветлены ў гістарыяграфіі. Гэта датычыць і праблемы доказу (вываду) шляхецтва. Аналіз пострэвалюцыйнай гістарыяграфіі паспрыяе лепшаму разуменню ўжо даследаваных аспектаў вываду шляхецтва, дазволіць акрэсліць актуальныя і нераскрытыя моманты.

Вывад шляхецтва ўяўляў сабой працэдуру, згодна з якой шляхцічы ў судовым парадку абгрунтоўвалі свае правы на прывілеяваны статус праз прадстаўленне пісьмовых (старажытныя граматы, прывілеі, запісы ў шляхецкіх попісах і г. д.) і вусных доказаў (звесткі іншай

© Красінскі І. В., 2024

шляхты). Працэс вываду шляхецтва ў ВКЛ быў вядомы ўжо з канца XV стагоддзя, а яго прававая рэгламентацыя распачата з прыняццем «Уставы о выводе шляхетства за примовою» (1507), у далейшым працягнута Статутамі ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гадоў.

Мэта артыкула — вызначыць дасягненні і праблемы пострэвалюцыйнай гістарыяграфіі па пытанні доказу шляхецтва ў Вялікім княстве Літоўскім.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Метадалогія даследавання складаецца з выкарыстання шэрагу метадаў і падыходаў, у прыватнасці, гісторыка-генеалагічнага і гісторыка-прававога. З дапамогай метадаў гісторыка-генеалагічнага падыходу можна прааналізаваць адпаведныя крыніцы (гербоўнікі, акты гродскіх і земскіх судоў, метрыкі ВКЛ і г. д.). Выкарыстанне гісторыка-прававога падыходу спрыяе лепшаму спалучэнню традыцый аналізу гістарычнага і прававога матэрыялаў.

Паколькі ў артыкуле разглядаюцца традыцыі гістарычных даследаванняў розных краін, рэгіёнаў і перыядаў, прымяняецца кампаратыўны падыход, які дазваляе прааналізаваць, суаднесці працы розных гісторыкаў і зрабіць больш глыбокія высновы. Асноўным метадалагічным прынцыпам выступае прынцып гістарызму. Ён дазваляе аб’ектыўна ўбачыць дасягненні і недахопы той ці іншай працы па праблеме даследавання, зразумець матыў і інструментарый даследчыкаў. У дадзеным артыкуле аўтар захоўвае аўтэнтычны гістарычны тэрмін «вывад шляхецтва», якім пазначаецца судовая працэдура доказу шляхецтва і ўсё, што з ёй звязана (матывы бакоў, пошук і подкуп сведкаў, розныя тактыкі паводзінаў у судзе, тыповыя і нетыповыя доказы і г. д.).

Абраны метадалагічны інструментарый дазваляе непрадузята ацаніць узровень пострэвалюцыйнай гістарыяграфіі пазначанай праблемы.

Матэрыяламі даследавання з’яўляюцца адпаведныя тэме працы гісторыкаў, крыніцазнаўцаў, генеалогаў, філолагаў і іншых спецыялістаў, выдадзеныя пасля рэвалюцыйных падзей 1917 года. Пострэвалюцыйная гістарыяграфія ахоплівае больш за 100 гадоў даследаванняў. Гэты перыяд умоўна можна падзяліць на два этапы: 1) 1917—1991 гады; 2) 1991 год — нашы дні. Першы этап (1917—1991) у большай ступені ахоплівае савецкую гістарыяграфію, а таксама працы, напісаныя ў краінах па-за савецкім ідэалагічным уплывам (напрыклад, Польская Рэспубліка 1918—1939 гадоў і Літоўская Рэспубліка 1918—1940 гадоў). З пункту гледжання даследаванняў сацыяльнай гісторыі (асабліва шляхецтва) гэта самы «бедны» перыяд. Так, некаторыя дарэвалюцыйныя гісторыкі (М. К. Любаўскі, У. І. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі і інш.) працягвалі друкавацца і ў 1920-я гады, а першыя наватарскія даследаванні без ужытку савецкай ідэалагічнай метадалогіі з’явіліся ўжо на рубяжы 1980—1990-х гадоў (напрыклад, А. П. Грыцкевіч). Другі этап пострэвалюцыйнай гістарыяграфіі (1991 год — нашы дні) — найбольш разнастайны і багаты на даследаванні шляхецкай праблематыкі. Сучасныя даследаванні сканцэнтраваны ва Украіне, у Беларусі, Польшчы, Літве і Расіі. У кожнай краіне захоўваюцца традыцыі нацыянальнай гістарыяграфіі з адпаведным ухілам у той ці іншы бок праблематыкі.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Савецкая гістарыяграфія амаль нічога не прынесла для разумення вываду шляхецтва ў ВКЛ. Са станаўленнем савецкай ідэалогіі, у тым ліку ў сферы гістарычнай палітыкі (1920-я гады), даследаванні «варожых» краін, дзяржаў і класаў былі фактычна спынены. Шляхта на савецкіх палітычных каардынатах знаходзілася ў катэгорыі «эксплуататараў», у сувязі з чым карысці для пралетарыяту ад даследавання шляхецтва не было. Зрэдку выдаваліся працы, галоўным чынам скончаныя яшчэ да рэвалюцыі (напрыклад, даследаванне У. І. Пічэты, выдадзенае ў 1958 годзе). Аднак пэўныя даследаванні вывадаў шляхецтва праводзіліся ў суседніх Польшчы і Літве. Так, у 1931 годзе выйшла двухтомная праца польскага медыевіста Г. Лаўмянскага, які вывучаў структуру родаў ВКЛ [1]. У даследаванні аўтар надаў шмат увагі пытанню генеалогіі розных родаў Жамойці. Даследчык на прыкладзе працэсу вываду шляхецтва Круповічаў і іншых адзначыў, што ў XVI стагоддзі



Репозиторий БарГУ

сярод шляхты ВКЛ панавала родавая арганізацыя [1, с. 351—352]. Шляхецкія роды часам мелі столько адгалінаванняў, што дасягалі звыш 50 асоб [1, с. 357]. Вывад шляхецтва даследаваў і польскі гісторык Я. Матушэўскі, аднак яго праца прысвечана польскім землям [2].

Станаўленне сучаснай гістарыяграфіі адбывалася ва ўмовах грунтоўных палітычных, ідэалагічных, культурных і сацыяльна-эканамічных змен. Найбольшае развіццё вывадаў шляхецтва атрымала ў даследаваннях сучасных украінскіх гісторыкаў. У працах В. М. Міхайлоўскага праведзены комплексны аналіз стану падольскай шляхты другой паловы XIV стагоддзя — 1570-х гадоў (у 1566—1569 гадах — Брацлаўскае ваяводства ў складзе ВКЛ). Даследчыкам закрануты такія праблемы, як наданне шляхецтва [3, с. 208—210], вывад роду Суліскіх (Шуліскіх) [3, с. 216].

Важнай працай трэба назваць манаграфію прафесара Н. М. Якавенкі, прысвечаную украінскай шляхце (Валынь і Цэнтральная Украіна) [4]. Аналізуючы прававы стан шляхты, гісторык перадала палажэнні зместаў «Уставы» 1507 года, Статутаў і соймавых канстытуцый у дачыненні да вываду шляхецтва [4, с. 46—52]. Асобны раздзел працы даследчык прысвяціла змаганню зямян за шляхецкія правы [4, с. 245—284], адзначыла, што дробная шляхта мела складанасці падчас доказу свайго паходжання [4, с. 253].

Так, Н. М. Якавенка заўважыла, што вывады шляхецтва часам ініцыяваліся з мэтай адцягвання ўвагі суддзяў ад асноўнай разглядаемай падчас суда справы. Аўтарам прыведзены прыклад працэсу 1630-х гадоў, які праходзіў ва Уладзіміры (Валынь). Нейкі Адам Кісель шукаў доказы супраць адваката Івана Грузевіча, які вёў справу апанента А. Кіселя [4, с. 253—254]. А. Кісель хацеў пазбавіць магчымасці ўдзелу адваката ў судовым працэсе праз доказ яго нешляхецтва. Аднак справа скончылася паразай для А. Кіселя. Н. М. Якавенка таксама падкрэсліла рэгіянальную асаблівасць вываду шляхецтва: так, у Цэнтральнай Украіне паступовая страта правоў зямянамі ў 1540—1560-я гады не прывяла да арганізаванага адстойвання паходжання і праявілася выключна ў індывідуальнай барацьбе [4, с. 276].

Адзінкавымі працамі, дзе вывад шляхецтва з'яўляецца галоўным прадметам даследавання, трэба адзначыць даследаванні ўкраінскага гісторыка А. А. Віннічэнкі [5—7]. Аднак аўтар у сваіх працах закрануў вывады шляхецтва ў асобных рэгіёнах (Люблінскае і Рускае ваяводствы ў XVII — першай палове XVIII стагоддзя), якія знаходзіліся пад уладай Каралеўства Польскага. Тым не менш частка гэтых тэрыторый знаходзілася раней у складзе ВКЛ, на якія распаўсюджвалася дзеянне Статута ВКЛ 1566 года, таму разгляд прац аўтара будзе цікавым даследчыкам гісторыі княства. На прыкладзе пяці вывадаў шляхецтва ў Любліне А. А. Віннічэнка зрабіў выснову пра існаванне рэгіянальных асаблівасцей вывадаў шляхецтва [6]. Было адзначана, што люблінская шляхта добра ведала судовую практыку і фактычна ніколі не ўдзельнічала ў працэсах доказу шляхецтва без важкіх аргументаў. Працэдура была дынамічнай, сведкі і доказы рознымі. Аўтар падкрэсліў, што часта шляхта адыходзіла ад прававой рэгламентацыі, што праяўлялася ў гатоўнасці ўдзельнічаць у працэсах без сведкаў і іншых фактараў, прапісаных у законе. Гэта ўплывала на фарміраванне рэгіянальных асаблівасцей вывадаў шляхецтва насуперак прававой рэгламентацыі. Аналагічныя высновы даследчык зрабіў у працы на матэрыяле Рускага ваяводства [7]. А. А. Віннічэнка таксама разглядаў вывады шляхецтва іншаземцамі [5].

Гісторыя шляхецтва ВКЛ вывучалася беларускім гісторыкам П. А. Лойкам [8]. У выніку правядзення комплекснага вывучэння шляхецкага саслоўя даследчык закрануў і вывад шляхецтва. На думку П. А. Лойкі, ужо ў першай палове XVI стагоддзя былі выразна бачныя крытэрыі шляхецтва, сярод якіх не было абавязковым валоданне зямлёй [8, с. 16—17]. Працэс кансалідацыі суправаджаўся шматлікімі судовымі разбіральніцтвамі аб прыцягванні шляхты да цяглай службы, якія рэгламентаваліся «Уставой...» 1507 года (у аўтара — 1522). Апошні рэзкі падзел паміж дробнай шляхтай і сялянствам, як лічыць даследчык, адбыўся падчас рэформы сярэдзіны XVI — пачатку XVII стагоддзя. Гісторык пералічыў легальныя каналы набыцця шляхецтва і звярнуў увагу на махінацыі падчас набыцця паходжання (выдача шляхцянак за мяшчан, якія пачыналі называць сябе таксама шляхціцамі; фальсіфікацыі



Рэпазіторый БарДУ

дакументаў; дадаванне «шляхецкіх канчаткаў» да прозвішчаў; публічныя драматызацыі; подкупы сведкаў і інш.) [8, с. 20]. Даследчыкам прааналізаваны прававыя аспекты рэгулявання вываду шляхецтва, зроблены акцэнт на важнасці соймавых канстытуцый 1578 і 1632 гадоў для спынення нелегальнага папаўнення прывілеяванага саслоўя [8, с. 20—21].

Вывад шляхецтва ў сваіх працах згадвалі Я. А. Юхо [9, с. 195, 207—208] і Т. І. Доўнар [10, с. 75] (прававое рэгуляванне), А. Ф. Вішнеўскі (набыццё і страта шляхецтва) [11, с. 50—51], Н. У. Казлоўская (генеалогія, прававы стан) [12; 13], А. М. Латушкін (паходжанне Яленскіх) [14], В. Л. Насевіч (інфармацыйныя рэсурсы ў генеалагічных даследаваннях) [15], Д. Л. Яцкевіч (малыя гербоўнікі шляхты) [16] і інш. У сучасных беларускіх даследаваннях актыўна выкарыстоўваюцца крыніцы гродскіх і земскіх судоў Менскага ваяводства. Так, менскую шляхту даследуе В. В. Калечыц (вывады шляхецтва зямян і баяр Менскага павета, напрыклад, Бабіцкіх [17], Бенедыктавічаў і Біруляў [18]).

Значнае месца ў даследаваннях вывадаў шляхецтва займаюць працы гісторыка Я. К. Анішчанкі. Аўтар актыўна даследаваў і складаў спісы шляхты Мінскага [19], Брэсцкага [20], Мсціслаўскага [21] ваяводстваў, Лідскага [22], Пінскага [23], Рэчыцкага [24], Мазырскага [25] і іншых паветаў, кранаючы праблему доказу паходжання розных родаў (Маршэўскія, Кавалеўскія, Матушэвічі, Скавінскія, Сташкевічы і інш.). Аднак трэба заўважыць, што для Я. К. Анішчанкі і большасці іншых беларускіх даследчыкаў вывад шляхецтва з'яўляецца пабочнай праблемай.

Важнае месца ў даследаваннях вывадаў шляхецтва займаюць працы беларускага гісторыка, генеалога і архівіста Я. С. Глінскага. Гісторык з'яўляецца кіраўніком шматтомнага выдання «Гербоўнік беларускай шляхты» і актыўна даследуе вываду шляхецтва XIX стагоддзя, а таксама родавыя легенды шляхецкіх родаў [26; 27], якія з'яўляліся своеасаблівым механізмам захавання статусу. Па большай частцы Я. С. Глінскага цікавяць пытанні вузкай групы сярод усяго шляхецкага саслоўя — зямян [28; 29]. У прадмове да першай часткі восьмага тома «Гербоўніка…» даследчык даў агульную характарыстыку вывада шляхецтва ў ВКЛ, адзначыў, што значная іх частка прыходзілася на часы «валочнай памеры» [29; 30]. Глінскі апісаў вывады шляхецтва родаў Кандыбаў, Бранавіцкіх, Гурыновічаў, Яўневічаў, Замайскіх і інш. Тым не менш даследчык заўважае, што вывады шляхецтва ў ВКЛ адбываліся па прычыне міжасабовых канфліктаў і не насілі масавага характару ў параўнанні з часамі разбораў шляхты. Даследчык шмат увагі надае верыфікацыі звестак, паколькі многія дакументы аб шляхецкім паходжанні былі сфальсіфікаваныя ў часы ВКЛ і асабліва падчас уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі [31].

Важным накірункам даследаванняў шляхецтва трэба адзначыць разгляд грамадска-палітычнага жыцця і ролі шляхты. Так, гісторык А. У. Мацук у сваёй манаграфіі [32] прысвяціў частку тэксту апісанню правядзення вывадаў шляхецтва на павятовых сойміках у часы Аўгуста III (1736—1763) [33]. Аўтар на падставе шырокай крыніцавай базы прывёў змест дакументаў, згодна з якімі было выведзена шляхецтва Глінскіх, Клімовічаў, Каўшэвічаў, Наркевічаў і інш. [33, с. 160—163].

Цікавяцца вывадамі шляхецтва беларускія філолагі і мемуарысты. Так, М. М. Улашчык [34, с. 35—49] і А. І. Мальдзіс [35, с. 139—140] даследавалі мемуарную спадчыну Беларусі з пункту гледжання адлюстравання ў гэтых крыніцах падзей айчыннай гісторыі. Абодва спецыялісты прааналізавалі змест мемуараў Марціна Матушэвіча і апісалі яго барацьбу з абвінавачваннямі ў нешляхецтве.

Такім чынам, у беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі назіраюцца падобныя тэндэнцыі. У пострэвалюцыйнай гістарыяграфіі пры разглядзе вываду шляхецтва дамінуюць генеалагічны і гісторыка-прававы накірункі. Тым не менш у параўнанні з дарэвалюцыйнымі даследаваннямі прыкметна павялічылася колькасць прац па сацыяльнай гісторыі, даследчае поле стала больш разнастайным і метадалагічна шырокім. Відавочным адрозненнем гістарыяграфічных падыходаў з'яўляецца акцэнт на рэгіянальных праблемах і выкарыстанне мясцовых крыніц з гродскіх і земскіх судоў, а таксама кніг Метрыкі ВКЛ. Аднак у цэлым вывад шляхецтва — новая і амаль недаследаваная праблематыка. Як асобны прадмет



Рэпазітарый БарГУ

даследавання і сацыяльную з’яву вывад шляхецтва вывучаў толькі А. А. Віннічэнка. Даследаванні гісторыка-прававога характару носяць рэпрадуктыўны характар. Практычна ў кожным даследаванні памылкова пазначаецца дата «Уставы». Відавочным з’яўляецца недахоп аналітычных даследаванняў, вывучэння сацыяльнай праблематыкі і агульнага разумення працэдуры вываду шляхецтва.

Літоўскія і польскія даследчыкі, як і беларускія, зацікаўлены ў вывучэнні розных праблем гісторыі ВКЛ. Вядомы даследчык Э. Гудавічус у абагульняючай працы пазначыў шырокавядомы факт пра праверку шляхецкіх правоў падчас валочнай памеры [36, с. 592—594]. Гісторык Р. Пятраўскас у сваёй працы прааналізаваў паняцце, функцыі і сацыяльнае значэнне родавай памяці і прыйшоў да высновы, што памяць пра продкаў дазваляла абараняць шляхетнасць [37, с. 105, 135—136]. У абагульняючай працы па гісторыі Літвы А. Эйдынтаса і іншых звернута ўвага на звесткі з Метрыкі ВКЛ, якія мелі важнасць для пацвярджэння шляхецтва [38, с. 62].

Праблема вываду шляхецтва ў ВКЛ мала цікавіць сучасных польскіх даследчыкаў. Большасць даследаванняў напісаны на польскім матэрыяле. Так, В. Навасад у сваёй працы прааналізаваў асуджэнне шляхецтва як фактар фарміравання родавага архіва на прыкладзе Крушыньскіх [39]. Супрацоўнікі Польскай акадэміі навук (PAN) у сваіх даследаваннях закранаюць землі ВКЛ толькі на падставе крыніц XIX стагоддзя (І. Сікорска-Кулеша, Р. Юркоўскі, Т. Эпштэйн).

Гісторыкі краін далёкага замежжа рэдка звяртаюцца да праблем гісторыі ВКЛ. Выключэннем з’яўляюцца працы шатландскага даследчыка Р. Фроста [40] і англійскага гісторыка Н. Дэвіса [41]. У адной са сваіх прац Р. Фрост пералічыў спосабы набыцця шляхецтва, а таксама звярнуў увагу на тое, што часам абвінавачванні ў нешляхецтве прыводзілі да фізічнага гвалту [40, с. 278—279]. Вывады шляхецтва, як лічыць англійскі гісторык Н. Дэвіс, спецыяліст па гісторыі Рэчы Паспалітай, прывялі да ўзнікнення традыцыі геральдычных кланаў і паспрыялі развіццю сямейных архіваў [41, с. 178].

Расійскія даследчыкі рэдка звяртаюцца да праблемы вываду шляхецтва. Пры гэтым можна адзначыць працы вядомага гісторыка М. Я. Бычковай [42], якая спаслалася на працу беларускага гісторыка У. І. Пічэты і адзначыла, што доказ шляхецтва на беларускіх і ўкраінскіх землях быў ускладнены пераважным выкарыстаннем тэрмінаў «баяры» і «зямяне», у той жа час «мелкая литовская шляхта, адоптированная польскими гербовыми родами, при доказательстве своего происхождения могла сослаться на эти роды, поскольку сам акт адопции ставил ее в привилегированное положение» [42, с. 230]. М. Я. Бычкова коратка апісала сутнасць вываду шляхецтва, адзначыла, што такія працэсы былі вядомы з канца XV стагоддзя. Аўтар сцвярджае, што ў ВКЛ існавала распрацаваная сістэма норм, якія абмяжоўвалі феадалаў ад пранікнення ў іх асяроддзе людзей іншых саслоўяў [42, с. 232]. Прававая сістэма ВКЛ у будучым актыўна выкарыстоўвалася ў справаводстве па працэсах доказу паходжання рускага дваранства.

З расійскіх даследчыкаў таксама трэба адзначыць працы генеалога С. У. Думіна, які разгледзеў вывады шляхецтва татараў Вялікага княства Літоўскага [43]. Аўтар адзначыў, што нягледзячы на знікненне сваяцкіх сувязяў паміж татарскімі родамі і арыстакратычным насельніцтвам ВКЛ у XVII—XVIII стагоддзях, пачуццё еднасці і асэнсаванне татарамі прыналежнасці да адзінай этнічнай групы дазволілі ім даказаць шляхецтва ў XIX стагоддзі.

**Заключэнне.** Пострэвалюцыйная гістарыяграфія вываду шляхецтва ў Вялікім княстве Літоўскім у параўнанні з папярэднім перыядам даследаванняў спрыяла далейшаму развіццю праблематыкі. Дарэвалюцыйныя гісторыкі (М. В. Доўнар-Запольскі, І. І. Лапо, Ф. І. Леантовіч, М. К. Любаўскі, С. Л. Пташыцкі, А. Банецкі, О. Халецкі, У. Сямковіч і інш.) разглядалі пераважна прававы бок працэдуры і асабліва генеалагічную праблематыку. У той жа час не былі даследаваны такія аспекты, як узнікненне і станаўленне, а таксама развіццё доказу шляхецтва, характэрныя рысы і асаблівасці судовых працэсаў на рэгіянальным узроўні, механізмы і сродкі доказу паходжання, вынікі працэсаў і іх уплыў на грамадства, паводзіны шляхты і інш.

Рэпазіторый БарДУ

Значным вынікам працы сучасных гісторыкаў і іншых спецыялістаў з'яўляецца паглыбленне генеалагічнай праблематыкі (Я. С. Глінскі, Я. К. Анішчанка, М. Я. Бычкова, А. М. Латушкін і інш.). З'явіліся першыя спецыяльныя даследаванні па дадзенай праблеме (А. А. Вінічэнка) з прэтэнзіямі на сацыяльную праблематыку. Між тым асобныя аспекты застаюцца неахопленымі гісторыкамі розных краін. Працы гісторыка-прававога характару не прынеслі прынцыпова новых вынікаў. Сацыяльныя, культуралагічныя, палітычныя, эканамічныя, працэсуальныя аспекты вываду шляхецтва ўсё яшчэ слаба вывучаны. Усё гэта актуалізуе даследаванне гэтай праблематыкі для гісторыкаў і спецыялістаў іншых навук. Доказ шляхецтва — складаная праблема сацыяльнай гісторыі ВКЛ, даследаванне якой дазволіць больш дакладна адлюстраваць перш за ўсё сацыяльныя працэсы, падзеі, дынаміку грамадства ВКЛ у XVI—XVIII стагоддзях.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Łowmiański, H.* Studja nad początkami społeczeństwa i państwa litewskiego : w 2 t. / H. Łowmiański. — Wilno : Towarzystwo Przyjaciół Nauk, 1931—1932. — T. 1.
2. *Matuszewski, J.* Nagana szlachectwa w Polsce w XV i XVI wieku / Jacek S. Matuszewski. — Łódź : Uniwersytet Łódzki, 1971. — S. 125—147.
3. *Михайловський, В. М.* Еластична спільнота. Подільська шляхта в другій половині XIV — 70-х роках XVI ст. / В. М. Михайловський. — Київ, 2012. — XXVIII + 448 с.
4. *Яковенко, Н. М.* Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII століття. Волинь і Центральна Україна / Н. М. Яковенко. — Київ : Критика, 2008. — 472 с.
5. *Вінниченко, О. О.* Боснійські шляхтичі та доведення ними шляхетства на сеймику Подільського воєводства 1738 р. (До питання про замкненість шляхетського стану в Речі Посполитій) / О. О. Вінниченко // Генеалогічні записки. — 2014. — Вип. 12. — С. 49—64.
6. *Вінниченко, О. О.* Доведення шляхетства на сеймиках Люблінського воєводства в перші десятиліття XVII ст. / О. О. Вінниченко // Соціум. Альманах соціальної історії. — Київ, 2020. — Вип. 15—16. — С. 41—82.
7. *Вінниченко, О. О.* Доведення шляхетства на сеймиках руського воєводства у Вишні (XVII — середина XVIII ст.): правова регламентація і повсякденна практика / О. О. Вінниченко // Повсякдення ранньомодерної України. Історичні студії. — Київ, 2012. — С. 13—58.
8. *Лойка, П. А.* Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI — першай трэці XVII ст. / А. П. Лойка. — Мінск : БДУ, 2002. — 99 с.
9. *Юхо, Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. — Мінск : Універсітэцкае, 1992. — 270 с.
10. *Довнар, Т. И.* Основания и результаты систематизации законодательства в Великом Княжестве Литовском в XVI в. / Т. И. Довнар // Актуальные проблемы гражданского права : сб. науч. тр. — Минск : МИТСО, 2013. — Вып. 2. — С. 65—99.
11. *Вішнеўскі, А. Ф.* Прававы статус сацыяльных груп насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага ў XIV — першай палове XVI стагоддзя / А. Ф. Вішнеўскі // Матэрыялы круглага стала, Мінск, 1 крас. 2016 г. / БДУ ; рэдкал.: Т. І. Доўнар (гал. рэд.), С. А. Калінін, Л. Л. Голубева. — Мінск : БДУ, 2016. — С. 49—58.
12. *Козловская, Н. В.* Генеалогия шляхты Великого Княжества Литовского как проблемное поле современной историографии / Н. В. Козловская // Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі: актуальныя праблемы і задачы : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: В. В. Урублеўскі ; рэдкал.: С. С. Юрэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2024. — С. 6—20.
13. *Козловская, Н. В.* Шляхта Великого княжества Литовского XIV–XVI вв. в современной белорусской историографии / Н. В. Козловская // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. Вып. 19 : в 3 ч. : сб. науч. ст. — Минск : РИВШ, 2019. — Ч. 1. — С. 190—201.
14. *Латушкін, А. М.* Пытанне паходжання роду Яленскіх герба «Корчак» і эвалюцыя іх прыватнага герба ў 20-я гады XVII — 30-я гады XIX ст. / А. М. Латушкін // Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі : актуальныя праблемы і задачы : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: В. В. Урублеўскі ; рэдкал.: С. С. Юрэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2024. — С. 189—214.
15. *Насевіч, В. Л.* Інфармацыйныя рэсурсы па генеалогіі Беларусі: перспектывы інтэграцыі / В. Л. Насевіч // Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі: актуальныя праблемы і задачы : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: В. В. Урублеўскі ; рэдкал.: С. С. Юрэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2024. — С. 29—37.
16. *Яцкевич, Д. Л.* Малый гербовник Рогачёвской шляхты / Д. Л. Яцкевич // Архіварыус. — 2010. — Вып. 8. — С. 255—276.
17. *Калечыц, В. В.* Зямяне і баяры маёнтка Койданаў Менскага павета ў XVI—XVIII стст. / В. В. Калечыц // Герольд Litherland. — 2021. — № 22. — С. 52—62.


Репозиторий БарГУ

18. *Калечиц, В. В.* Интеграция представителей свободного населения Великого Княжества Литовского в состав шляхты (на примере отдельных родов Минского повета) / В. В. Калечиц // Архіварыус. — Мінск, 2019. — Вып. 17. — С. 149—160.

19. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Минского воеводства: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2020. — 275 с.

20. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Брестского воеводства: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2011. — 234 с.

21. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Мстиславского воеводства: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2013. — 305 с.

22. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Лидского повета: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2013. — 309 с.

23. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Пинского повета: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2016. — 290 с.

24. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Речицкого повета: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2015. — 296 с.

25. *Анищенко, Е. К.* Шляхта Мозырского повета: список XVIII ст. / Е. К. Анищенко. — Минск : Изд-во Виктора Хурсика, 2014. — 229 с.

26. Гербоўнік беларускай шляхты / Я. С. Глінскі [і інш.] ; навук. рэд. А. Рахуба. — Мінск : Беларусь, 2022. — Т. 8, ч. 1 : К (Каборды—Карэцкія). — 927 с.

27. *Глінскі, Я. С.* Родавыя легенды шляхты ўсходнеславянскага паходжання ў Вялікім Княстве Літоўскім: тэндэнцыі развіцця ў XVII ст. / Я. С. Глінскі // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура : зб. навук. арт. : у 2 ч. — Мінск : Беларус. навука, 2017. — Ч. 1. — С. 429—438.

28. *Глінскі, Я. С.* Родавая памяць ці звычайны падман? Венская бітва 1683 г. у справах аб доказе дваранства ў Мінскай губерні / Я. С. Глінскі // Архіварыус. — 2015. — Вып. 13. — С. 92—100.

29. *Глінскі, Я. С.* Вывады шляхецтва зямянамі Слуцкага і Капыльскага княстваў у XVII—XVIII стст.: інтэрпрэтацыя і верыфікацыя звестак / Я. С. Глінскі // Матэрыялы VII Міжнар. навук.-практ. канф., Віцебск, 27—29 крас. 2023 г. : у 2 т. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. М. Дулаў, М. Ф. Румянцава (адк. рэд.) [і інш.]. — Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2023. — Т. 1. — С. 229—231.

30. *Глінскі, Я. С.* Працэс аб «нагане шляхецтва» ад 1562 г. і паходжанне зямянскага роду Браневічаў-Бранавіцкіх / Я. С. Глінскі // Архіварыус. — 2019. — Вып. 17. — С. 39—57.

31. *Глінскі, Я. С.* Фальсіфікацыі дакументаў аб дваранстве ў Слуцкім павеце Мінскай губерні ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. / Я. С. Глінскі // Беларускі гістарычны часопіс. — 2018. — № 5. — С. 24—34.

32. *Мацук, А. У.* Павятовыя соймікі ў сацыяльна-палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага (1697—1764 гг.) : монография / А. У. Мацук. — Вільня : Еўрап. гуманітар. ун-т ; Logvino literatūros namai, 2023. — 600 с.

33. *Мацук, А. У.* Павятовыя соймікі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы панавання Аўгуста III (1736—1763 гг.) / А. У. Мацук // Вялікае Княства Літоўскае : сучасныя беларускія даследаванні / пад рэд. А. Грушы ; Еўрап. гуманітар. ун-т. — Вільнюс, 2024. — С. 141—174.

34. *Улашчык, М. М.* Мемуары і дзённікі як крыніцы гісторыі Беларусі : з рукапіснай спадчыны / М. М. Улашчык. — Мінск, 2000. — 86 с.

35. *Мальдзіс, А. І.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі : эсэ ; Восень пасярод вясны : аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў / А. І. Мальдзіс. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 477 с.

36. *Гудавичюс, Э.* История Литвы. — М. : BALTRUS, 2005. — Т. 1, С древнейших времен до 1569 года. — 679 с.

37. *Пятраўскас, Р.* Літоўская знаць у канцы XIV—XV ст.: склад — структура — улада : пер. з літ. / Р. Пятраўскас. — 2-е выд. — Смаленск : Інбелкульт, 2014. — 385 с.

38. Historia Litwy / A. Eidintas [et al.]. — Wilno : Eugrimas, 2013. — 316 s.

39. *Nowosad, W.* Nagana szlachectwa jako czynnik archiwotwórczy na przykładzie archiwum rodziny Kruszyńskich z Nawry / W. Nowosad // Archiwa — Kancelarie — Zbiory. — 2008. — T. II. — C. 191—217.

40. *Frost, R. I.* The European Nobilities in the Seventeenth and Eighteenth Centuries / R. I. Frost ; ed. Hamish M. Scott. — 1st ed. — London : Palgrave, 1994. — Vol. 2, North, East and Central Europe. — P. 266—310; 411—415.

41. *Davies, N.* God's Playground: A History of Poland: In Two Volumes / N. Davies. — Rev. ed. — Oxford : Oxford University Press, 2005. — 2 vol.

42. *Бычкова, М. Е.* Русско-литовская знать XV—XVII вв.: источниковедение, генеалогия, геральдика / сост.: О. И. Хоруженко, Р. Б. Казаков. — М. : Квадрига, 2020. — 368 с.

43. *Dumin, S. W.* Tradycje genealogiczne i legendy rodowe Tatarów litewskich / S. W. Dumin // Tatarzy Wielkiego Księstwa Litewskiego w historii, języku i kulturze / pod. red. Joanny Kulwickiej-Kamińskiej i Czesława Łapicza. — Toruń : Towarzystwo Naukowe, 2013. — C. 61—89.

Репозиторий БарГУ

Паступіў у рэдакцыю 27.10.2024.